працы, стыль зносін з вучнямі і студэнтамі, ступень задаволенасці сваёй педагагічнай дзейнасцю і інш.

Дзякуючы адаптацыі складвасцца магчымасць паскарэння аптымальнага функцыяніравання асобы ў незвычайных абставінах. Калі адаптацыя не наступае, узнікаюць дадатковыя цяжкасці ў засваенні прадмета дзейнасці, парушэнне яе рэгуляцыі.

Таму можна з упэўненасцю сказаць, што калі адаптацыя ў перыяд педагагічнай практыкі прайшла паспяхова, то ў будучым мы атрымаем дастойнага спецыяліста-педагога сацыякультурнай сферы.

Л.М.Гамеза,
дацэнт Белдзяржуніверсітэта

## РОЛЯ ПЕДАГАГІЧНАЙ ПРАКТЫКІ Ў ПАДРЫХТОЎЦЫ СПЕЦЫЯЛІСТА-ФІЛОЛАГА

У працэсе падрыхтоўкі настаўніка высокай кваліфікацыі вялікае значэнне надаецца педагагічнай практыцы. Практыка з'яўляецца неабходным элементам навуковай арганізацыі вучэбнага працэсу і падрыхтоўкі спецыялістаў высокай кваліфікацыі ў вышэйшай навучальнай установе. Яна служыць сувязным звяном паміж тэарэтычным навучаннем студэнта і яго будучай самастойнай работай у школе, дапаўняе і ўзбагачае тэарэтычную падрыхтоўку студэнтаў, дае магчымасць для замацавання і паглыблення атрыманых ведаў, выкарыстання тэарэтычных палажэнняў. У ходзе педпрактыкі фарміруюцца асноўныя прафесійныя ўменні і навыкі. Будучы настаўнік назірае і аналізуе розныя бакі вучэбна-выхаваўчага працэсу, вучыцца праводзіць урокі розных тыпаў па прадмеце, вядзе пазакласныя і пазашкольныя заняткі, выхаваўчую работу. Пры гэтым ён непасрэдна ўдзельнічае ў рабоце педагагічных саветаў, прадметных метадычных аб'яднанняў, семінараў класных кіраўнікоў. Ён вучыцца будаваць адносі-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ны з калегамі на аснове такту, узаемапавагі, разумення педагагічных праблем.

Зыходзячы з гэтага, задачы, якія стаяць перад студэнтам у працэсе педагагічнай практыкі наступныя:

— паглыбленне тэарэтычных ведаў і ўдасканаленне практычных уменняў, атрыманых у вышэйшай навучальнай установе;

— планаванне, арганізацыя і аналіз вучэбна-выхаваўчага працэсу;

— выкананне функцыі класнага кіраўніка вучэбна-выхаваўчай установы, вядзенне выхаваўчай работы з вучнямі з улікам іх узроставых і індывідуальных асаблівасцей, усталяванне ўзаемаадносін з бацькамі і калегамі на аснове супрацоўніцтва;

— вядзенне дакументацыі ў адпаведнасці з адзінымі моўнымі і арфаграфічнымі правіламі пэўнай вучэбнай-выхаваўчай установы і Законам Рэспублікі Беларусь аб мовах.

Педагагічная практыка, такім чынам, уключае ў сябе:

— вучэбна-выхаваўчую работу настаўніка-прадметніка;

— дзейнасць класнага кіраўніка;

— псіхолага-педагагічнае вывучэнне школьнікаў;

— дзейнасць па фарміраванні прафесійна-педагагічных асобасных якасцей практыкантаў.

Вучэбная работа практыканта заключаецца, па-першае, у непасрэдным назіранні за педагагічным працэсам у школе. Студэнты паведваюць урокі мовы і літаратуры ў сярэдніх і старэйшых класах з мэтай вывучэння метадычнага вопыту творча працуючых настаўнікаў школы, а таксама асэнсавання пераемнасці ў выкладанні мовы і літаратуры, магчымай варыятыўнасці ўрокаў па адной тэме з улікам узроўню падрыхтоўкі школьнікаў.

Па-другое, яны вывучаюць вучняў класа, у якім праходзяць педагагічную практыку, наладжваюць кантакты з імі, вывучаюць чытацкія інтарэсы шляхам апытання і анкетавання школьнікаў, арганізоўваюць пазакласнае чытанне. Вялікую ўвагу ўдзяляюць стымуляванню чытацкіх інтарэсаў вуч-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

няў, формам кантролю за самастойным чытаннем, а таксама распрацоўцы педагагічнай канцэпцыі вывучэння тэмы, складанню індывідуальнага каляндарнага плана-графіка ўсёй работы на перыяд педагагічнай практыкі, падрыхтоўцы і правядзенню ўрокаў розных тыпаў з выкарыстаннем розных формаў і метадаў арганізацыі вучэбнай дзейнасці школьнікаў. Акрамя таго, студэнты праводзяць пазакласную работу па прадмеце. Шмат часу імі ўдзяляецца развіццю самастойнай творчай ініцыятывы вучняў з улікам узроставых і індывідуальных асаблівасцей. Пажаданы ўдзел практыкантаў у афармленні школьнага кабінета мовы і літаратуры.

Азнаямленне са школьнай дакументацыяй, набыццё навыкаў работы з класным журналам таксама ўваходзяць у вучэбную падрыхтоўку практыкантаў.

Выхаваўчая работа практыканта не абмяжоўваецца ўрокамі мовы і літаратуры. На працягу ўсяго перыяду праходжання педагагічнай практыкі студэнт набывае вопыт працы ў якасці класнага кіраўніка. Правядзенне пазакласных мерапрыемстваў дазваляе практыканту лепш пазнаёміцца з кожным вучнем, выявіць кола яго інтарэсаў, стварыць пазітыўны псіхалагічны настрой у класе. Таму планаванню выхаваўчай работы з вучнямі, правядзенню мерапрыемстваў і іх абмеркаванню з класным кіраўніком і студэнтамі надаецца вялікая ўвага.

Адказным момантам з'яўляецца складанне псіхолага-педагагічнай характарыстыкі школьніка. Выкананне гэтага задання прадвызначае мэтанакіраванае назіранне за школьнікам у працэсе вучэбнай дзейнасці і ў час камунікатыўных зносін з таварышамі. Метадамі вывучэння школьніка, акрамя назірання, з'яўляюцца гутарка і эксперымент.

У час педагагічнай практыкі студэнты звяртаюцца да метадычных работ і дапаможнікаў, адрасаваных славеснікам, вывучаюць вопыт настаўнікаў школы, абмяркоўваюць урокі, праведзеныя студэнтамі, вучацца аналізаваць улас-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ныя. Гэтыя віды дзейнасці спрыяюць фарміраванню ў студэнтаў неабходных прафесійных уменняў.

Паспяховасць педпрактыкі ў многім залежыць ад таго, наколькі дакладна студэнты ўсведамляюць сутнасць педпрактыкі. Таму неабходна ў ходзе тэарэтычнай падрыхтоўкі па методыцы выкладання прадметаў на ўстановачнай канферэнцыі па педагагічнай практыцы пазнаёміць будучых практыкантаў з яе мэтамі і задачамі, растлумачыць кожнае палажэнне. Сёння немагчыма ўявіць працэс падрыхтоўкі любога спецыяліста без вытворчай практыкі, без дакладнай і глыбока прадуманай сістэмы практычнай падрыхтоўкі.

**С.А.Ганчарова,**
**Л.А.Драчова,**
**ст. выкладчыкі Беларускага універсітэта культуры**

## ФАРМІРАВАННЕ ПРАФЕСІЙНЫХ НАВЫКАЎ СТУДЭНТАЎ СПЕЦЫЯЛІЗАЦЫІ "ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ СІСТЭМЫ Ў КУЛЬТУРЫ" НА БАЗАХ ПРАКТЫКІ

Асноўная мэта практыкі ў вышэйшай навучальнай установе падпарадкавана агульнай мэце навучання — дасягненню высокай якасці падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў адпаведных спецыяльнасцей для азначанай галіны народнай гаспадаркі.

Менеджэру ў сферы культуры неабходна валоданне сродкамі сістэмнай і камп'ютэрнай падтрымкі тых відаў дзейнасці, якія ўвасабляюць гэтую спецыялізацыю. Культуролаг-менеджэр інфармацыйнай службы павінен ажыццяўляць наступныя віды дзейнасці ва ўстановах культуры: навуковую, арганізацыйную, вытворчую. Ён павінен умець ствараць праекты інфармацыйных сістэм, ажыццяўляць выбар камп'ютэрных сродкаў падтрымкі інфармацыйнай дзейнасці,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ